Мінпрацы: 145 тысяч беларусаў у лютым працавалі ў рэжыме няпоўнай занятасьці

МЗС Беларусі не зарэгістраваў незалежны тэлеканал «Белсат»

У Беларусі пачалася масавая дактыляскапія непаўнагадовых

Актывістаў «Маладога фронту» пакаралі мільённымі штрафамі

Беларусь чакае чарговая дэвальвацыя рубля

Пазьняк і Маракоў сталі першымі ляўрэатамі прэміі імя Ф. Аляхновіча




Нядаўнія два зьезды моладзевых палітычных аб'яднаньняў «Маладыя дэмакраты» і ўстаноўчы зьезд партыі Беларуская хрысьціянская дэмакратыя могуць сьведчыць пра працэсы перагрупіроўкі моладзевых рухаў у апазыцыі.

«Маладыя дэмакраты» доўгі час лічыўся і быў моладзевым крылом Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП). І вось у канцы лютага прайшлі адразу два зьезды «Маладых дэмакратаў» – уласна моладзевай арганізацыі АГП «Маладыя дэмакраты» і ўстаноўчы зьезд Моладзевага хрысьціянска-сацыяльнага саюзу «Маладыя дэмакраты» (МХСС-МД).

Сутнасьць расколу, як камэнтуюць падзеі лідэры моладзевых арганізацыяў, пераважна ў стаўленьні да фармату супрацоўніцтва з «дарослымі» палітычнымі арганізацыямі. «Маладыя дэмакраты» АГП працягнуць падпарадкоўвацца Аб'яднаным дэмакратычным сілам (АДС), у якія ўваходзяць Аб'яднаная грамадзянская партыя (АГП), Партыя камуністаў Беларуская (ПКБ), Партыя БНФ, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя «Народная грамада» (БСДП НГ), а таксама іншыя аб'яднаньні, у тым ліку і рух «За свабоду» А. Мілінкевіча.

«Маладыя дэмакраты» МХСС лічаць, што АДС толькі імітуюць палітычную дзейнасьць і знаходзяцца пад уплывам камуністаў, а таму новая моладзевая арганізацыя намераная арыентавацца на рух «За свабоду», які хаця і ўваходзіць у АДС, але лічыць за лепшае ў многіх выпадках дзейнічаць самастойна.

28 лютага ў Менску адбыўся ўстаноўчы зьезд партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» (БХД). Падчас зьезду былі прынятыя праграмныя дакумэнты партыі, яе статут. Таксама былі абраныя чатыры сустаршыні.

У Нацыянальную раду (кіроўны орган ствoранай партыі) акрамя чатырох абраных падчас зьезду сустаршыняў БХД увайшлі




старшыня міжнароднай моладзевай арганізацыі «Малады фронт» (Чэхія) Зьміцер Дашкевіч, былы палітзьняволены і кіраўнік грамадзкага руху «Ініцыятыва» Андрэй Кім, кіраўнік аргкамітэту па стварэньні руху «Маладая Беларусь» Артур Фінькевіч, бард Андрэй Мельнікаў, пастар Эрнэст Сабіла, адказны сакратар аргкамітэту па стварэньні БХД Дзяніс Садоўскі. Такім чынам, да дзейнасьці БХД могуць быць далучаныя іншыя моладзевыя рухі, грамадзкія аб’яднаньні і ініцыятывы.

Бліжэйшым часам аргкамітэт партыі намераны падаць дакумэнты на рэгістрацыю ў Міністэрстве юстыцыі. Паводле закону гэта магчыма зрабіць на працягу аднаго месяца з моманту правядзеньня ўстаноўчага зьезду. Таксама на працягу аднаго месяца з дня падачы дакумэнтаў павінен быць дадзены адказ пра рэгістрацыю альбо адмову ў гэтым зь Мінюсту. Рэгістрацыя БХД стане паказчыкам гатоўнасьці ўладаў да дэмакратызацыі.

Заканамерна чакаць, што стварэньне БХД паскорыць альбо сыход актывістаў з «Маладога фронту», альбо заключэньне саюзу паміж гэтымі моладзевымі арганізацыямі. Аналягічным чынам заснаваньне МХСС-МД сур’ёзна прарэдзіць моладзевы актыў АГП.

Верагодна, што моладзевых актывістаў не задавальняе сам фармат супрацоўніцтва са «старэйшымі таварышамі» па барацьбе, з палітычнымі партыямі і ўсталяванай імі манаполіяй на прадстаўленьне інтарэсаў усёй дэмакратычнай апазыцыі. Акрамя таго, у партыях надзвычай нізкая вэртыкальная мабільнасьць, а ў АДС – забюракратызаваны мэханізм прыняцьця рашэньняў.

Непазьбежнасьць вырашэньня канфліктаў такога роду шляхам эмансыпацыі моладзевых рухаў ад партыяў і пошуку імі новых форм самаарганізацыі прагназаваліся яшчэ пасьля «намётавага гарадка» на Кастрычніцкай плошчы ў Менску ў сакавіку 2006 г. Тады стала зразумела, што лідэры партыяў не гатовыя і не жадаюць эфэктыўна супрацоўнічаць з моладзевымі актывістамі.

Увагу да моладзевага супраціву прыцягнула і зьяўленьне новага палітзьняволенага. Удзельнік «працэсу 14-ці» Арцём Дубскі быў арыштаваны ў Гомелі па дарозе з Украіны. Апазыцыянэра абвінавачваюць нібыта ў парушэньні правілаў адбываньня пакараньня за ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў. Яму пагражае ад 6 месяцаў да 3 гадоў пазбаўленьня волі. Дубскі жыў ва Ўкраіне ў сувязі з распачынаньнем супраць яго другой крымінальнай справы на радзіме.

Нагадаем, што «працэс 14-ці» – справа, распачатая паводле арт. 342 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь у дачыненьні да ўдзельнікаў мірнай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, што прайшла ў Менску 10 студзеня 2008 году.

А тым часам ва ўмовах крызысу ў Беларусі назіраецца падзеньне даходаў насельніцтва на тле росту беспрацоўя (афіцыйнага і схаванага).

Так, рэальная (то бок з улікам інфляцыі) налічаны сярэдні заробак у студзені 2009 г. у параўнаньні з папярэднім месяцам упаў адразу на 11,7% да Br919,6 тыс. Прычым у разрэзе асобных галінаў эканомікі сытуацыя выглядае яшчэ горш.

Адначасова адбываецца і павелічэньне беспрацоўя ў краіне. Так, у студзені 2009 г. лік



беспрацоўных узрос на 8,9% да 40,6 тыс. (0,9% ад эканамічна актыўнага насельніцтва). Практыка афіцыйнай рэгістрацыі ў якасьці беспрацоўнага ў Беларусі недастаткова распаўсюджаная. У прыватнасьці, дапамога па беспрацоўі (Br47,6 тыс., ці 20,3% ад бюджэту пражытачнага мінімуму, ці USD17) не зьяўляецца стымулам для пастаноўкі на ўлік, і насельніцтва шукае новую працу самастойна. У існуючай крызыснай сытуацыі беларусы заканамерна пачынаюць заўважна скарачаць спажываньне тавараў і паслуг.

Тым ня менш урад ставіць перад дырэктарскім корпусам задачу ўтрымліваць пэрсанал, выплочваць заробкі і захоўваць аб'ёмы вытворчасьці на максымальна магчымым узроўні, пры гэтым прагноз прыросту ВУП, прамысловай вытворчасьці, заробкаў на 2009 г. афіцыйна ня робіцца, а карэктыроўка дзяржбюджэту адкладаецца.

АФІЦЫЙНА

## Мінпрацы: 145 тысяч беларусаў у лютым працавалі ў рэжыме няпоўнай занятасьці

***Работнікі 240 беларускіх прадпрыемстваў і арганізацыяў працавалі ў лютым у рэжыме няпоўнай занятасьці ці былі вымушаныя сыходзіць у адпачынкі зь ініцыятывы наймальнікаў. Такія дадзеныя агучыў намесьнік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётар Грушнік.***

Паводле яго слоў, найбольш такіх прадпрыемстваў у Магілёўскай, Брэсцкай і Гомельскай абласьцях, найменш – у Віцебскай. Агульная колькасьць працуючых на іх склала больш за 145 тысяч чалавек.

Як заявіў намесьнік міністра, прадастаўленьне зь ініцыятывы наймальніка адпачынкаў, скарачэньне працоўнага часу трэба разглядаць як антыкрызысныя меры, накіраваныя «на захаваньне працоўных калектываў».

У той жа час Пётар Грушнік адзначыў, што павелічэньне аб'ёмаў неэфэктыўнага выкарыстаньня працоўнага часу на вытворчасьці – гэта патэнцыйная база для росту беспрацоўя і ўзьнікненьня сацыяльнай напружанасьці ў грамадстве.

*БелаПАН*

ПАЛІТЫКА

## МЗС Беларусі не зарэгістраваў незалежны тэлеканал «Белсат»

***Міністэрства замежных справаў Беларусі адмовіла ў рэгістрацыі бюро каналу «Белсат» у Беларусі.***

Як паведаміла БелаПАН дырэктар тэлеканалу Агнешка Рамашэўска, афіцыйнай прычынай для адмовы стала няправільнае афармленьне дакумэнтаў. «Спачатку ў нас месяц не прымалі дакумэнты, кажучы, што чагосьці не хапае. Потым прынялі і больш за два месяцы разглядалі,




а затым адмовілі, заявілі, што неяк ня так яны афармленыя», — сказала А. Рамашэўска.

Паводле ейных словаў, кіраўніцтва каналу пасьля кансультацыяў з адмыслоўцамі зноў паспрабуе зарэгістраваць сваё прадстаўніцтва ў Беларусі.

ГРАМАДЗТВА

## У Беларусі пачалася масавая дактыляскапія непаўнагадовых



***Міліцыянты разам з адміністрацыяй Лідскага каледжу праводзяць незаконную масавую дактыляскапію навучэнцаў.***

Як стала вядома прэс-службе «Маладога фронту» ад аднаго з выкладчыкаў навучальнай установы, у Лідскім каледжы пры Гарадзенскім унівэрсытэце імя Я. Купалы праводзіцца масавая дактыляскапія.

Міліцыянт і загадчык аддзяленьня бяруць адбіткі пальцаў прама падчас заняткаў - як у юнакоў, так і ў дзяўчын. Свае дзеяньні яны тлумачаць тым, што адбіткі пальцаў неабходныя «для ваенкамату і для пашпарта».

Навучэнцам, якія адмаўляліся рабіць дактыляскапію, пагражалі праблемамі ў вучобе. Гэта першы вядомы выпадак, калі праводзіцца незаконная масавая дактыляскапія ў непаўнагадовых у навучальнай установе Беларусі.

АПАЗЫЦЫЯ

## Актывістаў «Маладога фронту» пакаралі мільённымі штрафамі

***Буйнымі грашовымі штрафамі скончыліся суды над актывістамі «Маладога фронту», якія 2 сакавіка каля адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі пратэставалі супраць палітычнага тэрору.***

3 сакавіка ў суд Ленінскага раёну Менску прывезьлі зь ізалятару на Акрэсьціна актывістаў «Маладога фронту» Юлію Міхайлаву, Міколу Дземідзенку і Вадзіма Ханяўку. Напярэдадні іх затрымалі за пікетаваньне адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі. Маладафронтаўцы трымалі ў руках расьцяжку са словамі «Не - палітычнаму тэрору», а потым аднесьлі ў адміністрацыю пэтыцыю з патрабаваньнем спыніць перасьлед іх аднадумца Арцёма Дубскага.

Судзіла Юлію Міхайлаву судзьдзя Любоў Валевіч. Працэс ішоў усяго 5 хвілінаў. Юлія Міхайлава не прызнала сябе вінаватай. Пакаралі дзяўчыну штрафам у 30 базавых велічыняў, што адпавядае 1 мільёну 60 тысячам рублёў (369 даляраў).

Вялізныя штрафы прызначылі таксама Міколу Дземідзенку (1 мільён 875 тысяч рублёў, ці 653 даляры) і Вадзіму Ханяўку (875 тысяч рублёў, ці 305 даляраў).

*Радыё Свабода*

ЭКАНОМІКА

## Беларусь чакае чарговая дэвальвацыя рубля

***У дні візыту ў Беларусь місіі МВФ экспэрты заяўляюць, што рубель чакае новая дэвальвацыя.***

«Думаю, экспэрты ацэняць, як разьвіваецца сытуацыя з крызысам у Беларусі, як выконваюцца дамоўленасьці, дасягнутыя раней», – заявіў «Беларускаму партызану» былы старшыня Нацыянальнага банку Беларусі Станіслаў Багданкевіч.

Як заяўляе экспэрт, беларускія ўлады выкарыстоўваюць крэдыты «толькі на спажываньне».

«Па аб'ёме золатавалютныя рэзэрвы не памяншаюцца, але выдаткоўваюцца вельмі нерацыянальна, – лічыць Станіслаў Багданкевіч. – Усе крэдыты пайшлі на падтрыманьне курсу беларускага рубля, што, на мой погляд, у корані няправільна. Мы выкарыстоўваем свае золатавалютныя рэзэрвы толькі на спажываньне. Думаю, місія МВФ будзе рэкамэндаваць ажыцьцяўляць наступную лібэралізацыю».




Паводле меркаваньня Станіслава Багданкевіча, беларускія ўлады правядуць чарговы этап дэвальвацыі рубля.

«Я думаю, беларускія ўлады пойдуць на прынцыпе валявога, адміністрацыйнага рашэньня па гэтай праблеме, – лічыць экспэрт. – Якім яно будзе – цяжка сказаць. Эканоміка патрабуе, каб дэвальвацыя праходзіла і далей. Я бы настойваў на тым, каб спачатку публічна быў абвешчаны новы курс эканамічнай палітыкі, цалкам. Заснаваны на рынкавай эканоміцы, на рынкавых законах. Першы крок – рэформы, рэальныя рэформы, а не бутафорыя; а другім крокам ужо можна было б праводзіць дэвальвацыю. Рэформы трэба было пачынаць яшчэ 15 год таму, а ня сёньня».

КУЛЬТУРА

# Пазьняк і Маракоў сталі першымі ляўрэатамі прэміі імя Ф. Аляхновіча

***Першымі ляўрэатамі прэміі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры імя Францішка Аляхновіча сталі Зянон Пазьняк і Леанід Маракоў. Такое рашэньне прынята на пасяджэньні камітэту па прэміі 3 сакавіка ў Менску.***

Узнагароджваньне адбудзецца 29 кастрычніка, у Дзень памяці ахвяраў сталінізму ў Беларусі, які адзначаецца прадстаўнікамі грамадзкасьці, паведамляе БелаПАН.

Нагадаем, прэмія імя вядомага беларускага драматурга і тэатральнага дзеяча, вязьня савецкіх канцлягераў Францішка Аляхновіча прысуджаецца за вялікі ўнёсак у справу ўвекавечаньня памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій грамадзкім актывістам, дзеячам культуры і мастацтва, гісторыкам і краязнаўцам, літаратарам і журналістам.

Зянон Пазьняк зьяўляецца першаадкрывальнікам Курапатаў, а Леанід Маракоў - складальнікам шматтомнага энцыкляпэдычнага даведніку ахвяраў сталінізму.

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ БЕЛАРУСКАЯ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

польская дапамога

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.